# Nation of Leaders

Foundation of Civic Development



# Гадавая справаздача за 2024

# Уводзіны

**2024 год стаў годам росту і ўстойлівасці для нашай арганізацыі. Мы ганарымся вынікамі, якіх удалося дасягнуць, і дзякуем усім партнёрам, донарам, камандзе і студэнтам, якія зрабілі гэта магчымым.**

Праўленне Фонду

**Фонд грамадзянскага развіцця Nation of Leaders** (далей — NLF) — гэта некамерцыйная арганізацыя, заснаваная ў Польшчы ў 2021 годзе прадстаўнікамі беларускай дыяспары.

**Місія арганізацыі** — спрыяць фарміраванню актыўнага і свядомага грамадства Беларусі. Мы імкнёмся да таго, каб Беларусь стала незалежнай, квітнеючай краінай, што адкрытая для міжнароднага супрацоўніцтва і задае трэнды ў цывілізацыйным развіцці дзеля ўстойлівасці свету і чалавецтва.

У сваёй дзейнасці мы кіруемся **фундаментальнымі каштоўнасцямі**: свабодай, павагай да чалавечай годнасці, вяршэнствам права, законнасцю і справядлівасцю.

Для дасягнення гэтых мэт мы стварылі **адукацыйны хаб** Nation of Leaders, які з'яўляецца пляцоўкай для распрацоўкі і падтрымкі ініцыятыў, накіраваных на развіццё практычных навыкаў, неабходных для асобаснага росту, самаразвіцця, умацавання супольнасцяў і грамадства ў цэлым. Хаб падтрымлівае як праекты сваіх рэзідэнтаў, так і ініцыятывы выпускнікоў і іх супольнасцяў.

Каманда хаба, **рэзідэнты Nation of Leaders**, уключае больш за 30 чалавек з Польшчы, Беларусі, Літвы, Германіі, ЗША і Грузіі. Гэта аўтары курсаў, выкладчыкі, вядучыя майстар-класаў, эксперты, кансультанты, грамадскія дзеячы, а таксама спецыялісты, якія распрацоўваюць, адмініструюць і прасоўваюць адукацыйныя праекты.

Nation of Leaders імкнецца развіваць **экасістэму нефармальнай грамадзянскай адукацыі**, аб'ядноўваючы правайдараў адукацыйных паслуг, бізнес, беларускія і міжнародныя НДА і іншых стэйкхолдараў. Мы закладаем аснову для значных дэмакратычных змен, абапіраючыся на сумеснае выкарыстанне рэсурсаў, узаемнае навучанне і сістэмны падыход.

Мы выбудоўваем **узаемадзеянне з партнёрамі**, якія падзяляюць нашы каштоўнасці і бачанне. Гэтае супрацоўніцтва арганізуецца на прынцыпах этычнасці, даверу, кампетэнтнасці, узаемавыгаднасці і дадатковасці рэсурсаў. Яно вар'іруецца ад мікрапраектаў да стратэгічных ініцыятыў і накіраванае на стварэнне сінергічных эфектаў, якія забяспечваюць устойлівае развіццё грамадства.

# Вынікі працы ў 2024 годзе

## АНЛАЙН-НАВУЧАННЕ

**Запушчана 5 новых адукацыйных праграм** (курсаў) на платформе.

**Праведзена 27 патокаў** існуючых і новых адукацыйных праграм (кожны курс запускаецца цыклічна, ад 1 да 3 патокаў на год).

**1427** рэгістрацый на курсы.

**6 рэгіянальных суполак умацавалі свой арганізацыйны патэнцыял дзякуючы спецыялізаваным праграмам.**

## АГУЛЬНАЯ КОЛЬКАСЦЬ УДЗЕЛЬНІКАЎ КУРСАЎ І ПРАГРАМ НА ПЛАТФОРМЕ (НАКАПЛЯЛЬНА)



# Вынікі працы ў 2024 годзе

## КОЛЬКАСЦЬ РЭГІСТРАЦЫЙ НА КУРСЫ Ў 2024




- Свядомае бацькоўства ва ўмовах няпэўнасці. 3 патокі
- Ад выгарання да рэсурсу. 2 патокі
- Гендар з нуля: разбіраемся разам. 3 патокі
- Сейбіт Прамовы. Эфектыўны публічны выступ. 2 патокі
- Радавод: аднаўляем гісторыю сваёй сям'і і краіны. 2 патокі
- Мэта. План. Вынік. 2 патокі
- Вырашэнне канфліктаў: навыкі для жыцця. 3 патокі
- Унутраная сіла. Як пераадолець вывучаную бездапаможнасць. 2 патокі
- Публічная палітыка для пачаткоўцаў. 3 патокі
- Экашлях: маленькія крокі да вялікіх змен. 2 патокі
- Ступені. Пераадоленне выгарання. Аднаўленне рэсурсу. 1 паток
- Суполка NEXT: ад супольнасці да арганізаванасці - крокі да ўстойлівасці. 1 паток
- Прававы самапамочнік на кожны дзень. 2 патокі

# Вынікі працы ў 2024 годзе

**СУПРАВАДЖЭННЕ ВЫПУСКНІКОЎ**

Праведзена **33 адкрытыя адукацыйныя анлайн-падзеі**, у тым ліку 32 майстар-класы, 19 з якіх адбыліся ў фармаце галасавых чатаў з псіхолагамі NLF, і адна сустрэча з госцем NLF.

**Працягнулі працу 4 клубы:**

- матывацыйны клуб (21 удзельнік),
- дзённікі дасягатараў (22 удзельнікі),
- клуб псіхалагічнай самадапамогі (28 удзельнікаў),
- унутраны клуб каманды NLF (13 удзельнікаў).

**Створаныя 2 новыя клубы:**

- клуб беларускай мовы (47 удзельнікаў),
- клуб трэніроўкі кагнітыўных навыкаў (47 удзельнікаў).

**Праведзена 45 кансультацый (177 гадзін)** для выпускнікоў па ключавых тэмах: вырашэнне канфліктаў, кіраванне камандай, бяспека, устойлівае развіццё, псіхалогія, камунікацыя, экалогія, развіццё супольнасцяў, тайм-менеджмент, гендарная пісьменнасць.

**Распрацаваныя канцэпцыі:**

- інкубацыйнай праграмы,
- пралангіраванага семінара,
- праграмы валанцёрскага ўдзелу.



# Вынікі працы ў 2024 годзе

## РАЗВІЦЦЁ ПАРТНЁРСКАЙ СЕТКІ NLF

**Пашырана міжнароднае супрацоўніцтва:**

- Падпісаныя дамовы з Аляксандраўскім інстытутам (Фінляндыя), Дацкім інстытутам культуры (Латвія) і Good People (Данія) для рэалізацыі праекта «Паралельныя грамадствы: постсавецкая іміграцыя ў краінах Паўночнай Еўропы і Балтыі».
- Сфарміраваная міжнародная тэматычная рабочая група ў рамках супрацоўніцтва з Collective Leadership Institute (CLI) па распрацоўцы механізмаў міжсектарнага ўзаемадзеяння. Мы правялі дыскусію на гэтую тэму на фестывалі Tutaka.

Распрацаваны і запушчаны **курс па развіцці суполак**, а таксама канцэпцыя акселерацыйнай праграмы для правайдараў адукацыі.

**Рэзідэнты і каманда хаба ўзялі ўдзел у партнёрскіх ініцыятывах:**

- у ролі ментараў і менці ў ментарынгавай праграме сацыяльных праектаў;
- у публікацыі, перакладзе і тэсціраванні Інструмента самаацэнкі адукацыйнай анлайн-паслугі (даступны на www.tool4edu.online);
- у рэалізацыі сацыяльна значнага праекта рэзідэнткі хаба, дзе NLF выступіў у ролі адміністрацыйнага партнёра.

## РАЗВІЦЦЁ АРГАНІЗАЦЫІ І КАМАНДЫ

**Інстытуцыяналізаваныя раней запушчаныя працэсы:**

- распачала працу рада фонду (назіральная рада), якая выконвае кансультацыйныя і кантрольныя функцыі;
- пачалі дзейнасць такія структурныя адзінкі, як Цэнтр суправаджэння выпускнікоў, Цэнтр развіцця клубнай прасторы, Служба маніторынгу і ацэнкі.

**Да каманды далучыліся:**

- новыя аўтары і выкладчыкі;
- прадзюсар адукацыйных прадуктаў;
- спецыяліст па маніторынгу і ацэнцы;
- кіраўнікі Цэнтра развіцця клубнай прасторы і Цэнтра суправаджэння выпускнікоў;
- каардынатар групы фандрайзінгу.

Гэтыя новыя спецыялісты значна ўзмацнілі патэнцыял арганізацыі.

Распачатая праца над стварэннем **Маніфеста Nation of Leaders** — публічнай дэкларацыі мэт, каштоўнасцяў і прынцыпаў.

Сябры каманды ўзялі  ўдзел у 48 мерапрыемствах (канферэнцыі, форумы, семінары, дыскусіі), накіраваных на развіццё адукацыі (у тым ліку нефармальнай адукацыі дарослых), культуры і грамадска-палітычнай дзейнасці, што дазволіла павысіць прафесіяналізм і наладзіць супрацоўніцтва з іншымі арганізацыямі і экспертамі.

# Фінансавая ўстойлівасць

Аснову калектыву Nation of Leaders складаюць прафесіяналы, аб'яднаныя агульнымі мэтамі і імкненнем да развіцця. Кожны ўдзельнік нашай каманды робіць значны ўнёсак у развіццё адукацыйных праектаў хаба. Мы разам расцём і развіваемся, абменьваемся досведам, ведамі і вучымся адно ў аднаго, ствараючы асяроддзе для няспыннага прафесійнага і асабістага росту.

Дзейнасць Nation of Leaders, яе адукацыйны патэнцыял станоўча ацанілі пяць фондаў падтрымкі развіцця грамадзянскай супольнасці Беларусі. Іх дапамога спрыяла стварэнню больш устойлівай арганізацыйнай структуры, павышэнню ўзаемаразумення ў камандзе, пабудове сістэмы менеджменту якасці нашай дзейнасці, а таксама забяспечыла магчымасць развіцця анлайн-навучання — распрацоўкі пяці новых адукацыйных праграм, правядзення 21 патоку курсаў і 6 праграм для падтрымкі супольнасцяў.

## КРЫНІЦЫ ФІНАНСАВАННЯ ДЗЕЙНАСЦІ АРГАНІЗАЦЫІ Ў 2024 ГОДЗЕ




- падрыхтоўка вэбінараў
- правядзенне адкрытых анлайн-мерапрыемстваў
- напісанне артыкулаў
- мадэрацыя чатаў
- мадэрацыя вэбінараў
- аказанне псіхалагічнай падтрымкі і г.д.

# Планы на 2025 год

## АДУКАЦЫЙНЫЯ ЗАДАЧЫ ХАБА

- стварыць і запусціць мінімум 4 новыя адукацыйныя праграмы;
- забяспечыць не менш за 1500 рэгістрацый на курсы і праграмы для суполак;
- правесці не менш за 28 патокаў існуючых і новых курсаў;
- развіваць кансультацыйную службу для комплекснай падтрымкі актыўных беларусаў і беларусак, забяспечваючы доступ да сэрвісаў, якія спадарожнічаюць адукацыі;
- падтрымліваць развіццё клубаў і гурткоў, узмацняючы ініцыятыву, цікавасць і лідарства выпускнікоў;
- запусціць змененую праграму валанцёрскага ўдзелу для ўмацавання арганізацыі і асобаснага росту ўдзельнікаў;
- правесці інкубацыйную праграму сацыяльных праектаў выпускнікоў на конкурснай аснове;
- правесці хакатон для арганізацый і ініцыятыў, якія маюць ідэі сацыяльна значных адукацыйных праектаў, і запусціць для ўдзельнікаў і пераможцаў хакатону акселерацыйную праграму;
- запусціць пілоты новых адукацыйных фарматаў (семінараў, інтэнсіваў і інш.).

## ЗАДАЧЫ ПА РАЗВІЦЦІ ПАРТНЁРСКАЙ СЕТКІ



- сфарміраваць пастаянную арганізацыйную адзінку для развіцця партнёрскай сеткі;
- пашырыць супрацоўніцтва з іншымі ініцыятывамі і арганізацыямі з блізкімі місіямі, якія дзейнічаюць у галіне адукацыі дарослых і сумежных сферах, звязаных з умацаваннем патэнцыялу беларускай грамадзянскай супольнасці;
- запусціць праект па развіцці міжсектарнага ўзаемадзеяння — некамерцыйнага і камерцыйнага;
- правесці двухдзённы афлайн-семінар у межах міжнароднага праекта па інтэграцыі мігрантаў з постсавецкай прасторы ў грамадствы краін Паўночнай Еўропы і Балтыі.

# Планы на 2025 год

## ЗАДАЧЫ Ў СФЕРЫ МАРКЕТЫНГУ І PR



- распрацаваць і пачаць рэалізацыю PR-стратэгіі для павышэння пазнавальнасці і пашырэння кола ўплыву NLF з улікам змены ўмоў жыцця беларускага грамадства;
- узмацніць прасоўванне адукацыйных прадуктаў для прыцягнення ў праекты хаба большай колькасці ўдзельнікаў;
- распрацаваць і запусціць пастаянны збор і аналіз дадзеных, каб адукацыйныя прадукты NLF адпавядалі надзённым выклікам часу, патрэбам і чаканням мэтавай аўдыторыі (дарослых беларусаў), забяспечваючы дасягненне місіі арганізацыі.

## ЗАДАЧЫ Ў СФЕРЫ АРГАНІЗАЦЫЙНАГА РАЗВІЦЦЯ І ПАВЫШЭННЯ ЎСТОЙЛІВАСЦІ

- сфармуляваць тэорыю змен арганізацыі;
- удасканаліць сістэму прыняцця рашэнняў, структуру органаў кіравання арганізацыі (праўленне, назіральная рада, камітэт дэпартаментаў, прадстаўнічы орган супольнасці рэзідэнтаў);
- умацаваць сістэму бяспекі з улікам павышаных рызык для ўдзельнікаў унутры краіны ў сувязі з уключэннем медыярэсурсаў NLF у пералік арганізацый, якія маюць дачыненне да экстрэмісцкай дзейнасці;
- вызначыць, хто такія рэзідэнты хаба і прынцыпы іх удзелу ў жыцці супольнасці;
- працягнуць працу над укараненнем сістэмы маніторынгу і ацэнкі;
- завяршыць працу па маніфесце і правесці яго прэзентацыю;
- пашырыць і ўзмацніць каманды Цэнтраў суправаджэння выпускнікоў і развіцця клубнай прасторы;
- забяспечыць пастаяннае ўнутрыарганізацыйнае павышэнне кваліфікацыі выкладчыкаў — рэгулярны семінар;
- завяршыць працэс рэгістрацыі ў польскім Рэестры публічных прадпрыемстваў для атрымання магчымасці быць бенефіцыярам 1,5% падаходнага падатку ад прыватных асоб, а таксама забяспечыць магчымасць ільготнага падаткаабкладання для юрыдычных дарыльшчыкаў.

# Падрабязней пра хаб

**Увесь 2024 год удзельнікі праектаў хаба маглі ўзяць удзел у актыўнасцях рознага фармату:**

- курсы на адукацыйнай анлайн-платформе;
- адкрытыя падзеі: майстар-класы, лекцыі, семінары;
- адукацыйны блог у сацыяльных сетках NLF (адукацыйныя артыкулы);
- сетка чатаў выпускнікоў;
- клубы і гурткі (трымальнікі і вядучыя якіх — выпускнікі і рэзідэнты);
- кансультацыйная падтрымка выпускнікоў і іх суполак.



# Анлайн-навучанне

У 2021 годзе мы запусцілі **анлайн-платформу**, якая дазваляе навучацца ананімна і бясплатна. Нашы адукацыйныя праграмы (курсы) даюць магчымасць набываць веды, якія дазваляюць паспяхова і эфектыўна вырашаць свае асабістыя задачы, неадкладна выкарыстоўваюць веды і навыкі на практыцы, а таксама супрацоўнічаць, каардынаваць, наладжваць працу груп людзей, суполак.

**Адукацыйная праграма** платформы пастаянна карэктуецца зыходзячы з актуальных выклікаў, якія стаяць перад грамадзянскай супольнасцю Беларусі, а таксама запытаў мэтавай аўдыторыі (апытанні ў сацыяльных сетках, зваротная сувязь і пытанні ў тэлеграм-чатах патокаў і выпускнікоў, анкеты выпускнікоў кожнага курса (за гады працы сабрана больш за 1000 анкет)).

**Навучанне** праходзіць у групах. У сярэднім кожны курс складаецца з 6–10 модуляў і доўжыцца ад 3 да 8 тыдняў. Асноўныя фарматы арганізацыі вучэбнай работы — відэалекцыі (у сярэднім 8–20 хвілін кожная, у цэлым 1,5–4 гадзіны відэакантэнту), практычныя заданні, вэбінары. На нашай анлайн-платформе таксама размяшчаюцца хатнія заданні (практыкаванні, тэсты), дадатковыя матэрыялы. Для кожнага патоку ствараюцца тэлеграм-чаты. У 2024 годзе вэбінары (3–8 вэбінараў у залежнасці ад праграмы курса) таксама праходзілі ў Тэлеграме. Традыцыйна курсы праводзяцца цыклічна, паўтараючыся раз на 3–6 месяцаў. Відэалекцыі адкрываюцца ў пэўныя дні, на вэбінарах выкладчыкі сумесна з удзельнікамі дыскутуюць, аналізуюць хатнія заданні, выконваюць і абмяркоўваюць практычныя заданні па пэўнай тэме, тлумачаць заданні наступных модуляў. Пры паспяховым праходжанні курса ўдзельнік па жаданні можа звярнуцца па сертыфікат.

На платформе мы імкнёмся ствараць **прастору**, дзе прыемна знаходзіцца, дзе ўзнікае адчуванне далучанасці. **Выкладчыкі** — ключавыя фігуры адукацыйнага працэсу: яны ствараюць нязмушаную атмасферу і падтрымліваюць удзельнікаў у пошуку сэнсаў таго, што адбываецца, і варыянтаў вырашэння актуальных для іх праблем. Іх адрозніваюць здольнасць забяспечыць удзельнікам свабоду выкарыстання вывучанага на сабе, адкрытасць да іх патрэб і даступнасць для зносін. Прыняты ў хабе рух «ад вучня» дае выкладчыкам магчымасць «імправізаваць», а ўдзельнікам — свабоду выбару матэрыялаў і формаў навучання.

Удзельнікі курсаў камунікуюць паміж сабой і з камандай праекта ў **разгалінаванай сетцы чатаў**, абменьваючыся досведам і падтрымліваючы адно аднаго. Пасля заканчэння навучання ўдзельнікам прапануюць далучыцца да некаторых іншых чатаў, якія дзейнічаюць стала: чаты выпускнікоў курсаў, агульны чат NLF, клубы і гурткі. Там можна атрымаць кансультацыю выкладчыкаў і іншых удзельнікаў, прапанаваць тэму для абмеркавання, правядзення майстар-класа, стварэння курса ці артыкула.

Для падтрымкі і развіцця супольнасці, для хуткага адказу на актуальныя запыты аўдыторыі ў 2024 годзе праходзілі **майстар-класы** запрошаных экспертаў і нашых выкладчыкаў, а таксама **падтрымныя галасавыя чаты з псіхолагамі**. Тэмы такіх сустрэч падказваюць удзельнікі курсаў, выпускнікі і сябры каманды.

## Нашы актуальныя адукацыйныя праграмы (курсы)

**Прававы самапамочнік на кожны дзень**
Вывучэнне і абарона грамадзянскіх правоў для паляпшэння жыцця проста цяпер

**Мэта. План. Вынік.**
Фармуляванне, планаванне і рэалізацыя мэт эфектыўна і з захаваннем жыццёвага рэсурсу

**Радавод**
Аднаўленне гісторыі сваёй сям'і і краіны

**Вырашэнне канфліктаў. Навыкі для жыцця**
Развіццё навыкаў канструктыўнага вырашэння канфліктаў з карысцю для ўзаемаадносін

**Унутраная сіла. Як пераадолець вывучаную бездапаможнасць**
Праграма пошуку ўнутраных апор і ўмацавання ўпэўненасці ў сабе

**Сейбіт Прамовы. Эфектыўны публічны выступ**
Вывучэнне асноў аратарскага майстэрства, развіццё навыкаў публічных выступаў

**Разам. Наладжваем камфортныя адносіны ў нашай суполцы**
Садзейнічанне стварэнню давернай атмасферы ў суполцы праз навучанне метадам эфектыўнага ўзаемадзеяння

**Публічная палітыка для пачаткоўцаў**
Зразумець сваю ролю ў развіцці дзяржавы, умець эфектыўна ўплываць на гэты працэс

## Створаныя ў 2024 годзе

**Свядомае бацькоўства ва ўмовах няпэўнасці**
Спрыянне развіццю свядомага падыходу да выхавання дзяцей праз засваенне навыкаў устойлівасці да негатыўных уплываў

**Ад выгарання да рэсурсу. Знайсці сябе, сілы, устойлівасць і сэнс**
Распазнанне і пераадоленне перыядаў апатыі і выгарання

**Гендар з нуля: разбіраемся разам**
Фарміраванне справядлівага грамадства праз развіццё гендарнай пісьменнасці

**Экашлях: маленькія крокі да вялікіх змен**
Укараненне экапрыязных звычак для паляпшэння ўласнага жыцця і стану навакольнага асяроддзя

**Суполка NEXT**
Вучымся аб'ядноўваць людзей, умацоўваць патэнцыял суполак і павышаць іх устойлівасць для дасягнення пазітыўных змен у грамадстве

# Суправаджэнне выпускнікоў

Праца **Цэнтра суправаджэння выпускнікоў** накіраваная на падтрымку развіцця актыўных удзельнікаў грамадзянскай супольнасці Беларусі, на стварэнне ўмоў, якія спрыяюць росту асабістай сталасці і грамадзянскай актыўнасці, неабходных для ўстойлівых сацыяльных змен, і заснаваная на разуменні, што гэты працэс магчымы праз серыю якасных крокаў і трансфармацый.

**Кансультацыйная падтрымка** выпускнікоў (індывідуальных і супольнасцяў), запушчаная восенню 2023 года, прапануе экспертныя кансультацыі па такіх тэмах, як кіраванне, псіхалогія, экалогія, камунікацыя і гендарная пісьменнасць. Гэтыя кансультацыі дапамагаюць вырашаць актуальныя праблемы, больш актыўна ўключацца ў грамадскую дзейнасць і далучаць іншых да працэсаў пазітыўных змен.

**Інкубацыйныя праграмы** (у распрацоўцы) — гэта кароткатэрміновыя праграмы для ўдзельнікаў нашай супольнасці, дзякуючы якім яны пры падтрымцы экспертаў NLF змогуць ствараць і развіваць свае ініцыятывы. Такія праграмы будуць праводзіцца на конкурснай аснове. У канцы 2024 года быў распрацаваны драфт першай праграмы, якая пройдзе вясной 2025 года.

**Пралангіраваны семінар** (у распрацоўцы) — адукацыйная праграма, у працэсе якой удзельнікі змогуць распрацаваць індывідуальную траекторыю развіцця, разбярууцца ў дзеянні, як ажыццяўляць паспяховыя змены ў сваім жыцці і сваім асяроддзі. У 2024 годзе камандай напісаны папярэдні канцэпт праграмы.

**Праграма валанцёрскага ўдзелу** была прыпыненая. У 2024 годзе пачалася трансфармацыя працэсу ўдзелу валанцёраў у дзейнасці хаба.

**Клубы і гурткі** — гэта частка экасістэмы хаба, якая дазваляе выпускнікам і рэзідэнтам запусціць групу, у якой можна сумесна з калегамі развіваць свае навыкі, кампетэнцыі і проста атрымліваць задавальненне ад сумеснага баўлення часу, адчуваць сябе часткай чагосьці большага, праяўляць свае лідарскія якасці і індывідуальнасць.



# Нашы клубы і гурткі

**Клуб беларускай мовы**

Адкрытая для ўсіх ахвочых прастора для ўзаемнай падтрымкі і развіцця навыку зносін на беларускай мове, абмеркавання тэм, звязаных з нацыянальнай культурай, традыцыямі, слыннымі асобамі і не толькі

**Матывацыйны клуб**

Узаемаабмен досведам і ведамі ўдзельнікаў на шляху іх самаразвіцця, матывацыя і падтрымка адно аднаго ў новых пачынаннях

**Дзённікі дасягатараў**

Вядзенне дзённікаў самарэфлексіі і атрыманне падтрымкі ў коле аднадумцаў, бяспечныя зносіны без крытыкі і парад

**Клуб псіхалагічнай самадапамогі**

Развіццё псіхалагічнай культуры, засваенне метадаў і спосабаў эмацыйнай самарэгуляцыі і псіхалагічнай самадапамогі, узаемная падтрымка

**Унутраны клуб каманды**

Пляцоўка для абмеркавання сітуацыі ў розных сферах дзейнасці і жыцця ўнутры Беларусі, пошуку рашэнняў і ролі NLF у іх рэалізацыі

**Клуб трэніроўкі кагнітыўных навыкаў**

Дзейнасць клуба накіраваная на развіццё кагнітыўных навыкаў, розных відаў мыслення: гэта магчымасць палепшыць свае вынікі ў вучобе ці працы праз павышэнне прадуктыўнасці і эфектыўнасці мыслення

# Партнёрская сетка NLF

У 2024 годзе пачала складвацца партнёрская сетка NLF, каманда хаба працавала над умацаваннем сувязі з беларускімі і міжнароднымі арганізацыямі, якія падзяляюць нашыя каштоўнасці і місію. Мы засяродзіліся на стварэнні ўмоў для сумеснай працы, накіраванай на паляпшэнне якасці нефармальнай грамадзянскай адукацыі, падтрымку суполак і прасоўванне інавацыйных адукацыйных ініцыятыў.

**Ключавыя кірункі працы:**

- фарміраванне ўстойлівых партнёрстваў для ўзмацнення ўзаемадзеяння ў галіне адукацыі дарослых і сумежных сферах;
- распрацоўка новых інструментаў і падыходаў, уключаючы акселерацыйныя праграмы, якія падтрымліваюць развіццё правайдараў адукацыі;
- спрыянне міжнароднаму супрацоўніцтву праз удзел у праектах, накіраваных на інтэграцыю мігрантаў і пераадоленне бар'ераў паміж сектарамі;
- стварэнне новых магчымасцяў для рэзідэнтаў і выпускнікоў хаба праз партнёрскія ініцыятывы, ментарства і ўдзел у распрацоўцы сацыяльна значных праектаў.



# Службы падтрымкі і развіцця хаба



**Анлайн-платформа** арганізуе набор удзельнікаў, правядзенне курсаў, суправаджэнне выпускнікоў, а таксама рэфлексію і дапрацоўку кантэнту для забеспячэння якасці адукацыйных праграм і камунікацыі ўнутры супольнасці.

**Прадзюсарскі цэнтр** каардынуе працэс стварэння адукацыйнага кантэнту: ад апрацоўкі заяўкі на стварэнне новага прадукту і распрацоўкі канцэпта і навучальных матэрыялаў курса да вытворчасці відэаматэрыялаў, размяшчэння матэрыялаў курса на анлайн-платформе і іх далейшага ўдасканалення з улікам зваротнай сувязі ад усіх удзельнікаў адукацыйнага працэсу.



**Навукова-метадычны цэнтр** забяспечвае экспертызу адукацыйных прапаноў і праграм, што распрацоўваюцца, спрыяе павышэнню якасці рэгулярных працоўных працэсаў, актыўна ўдзельнічае ў працэсе развіцця экасістэмы нефармальнай грамадзянскай адукацыі.



**Цэнтр суправаджэння выпускнікоў** стварае для выпускнікоў хаба асяроддзе падтрымкі, якое ўключае адукацыйныя магчымасці, настаўніцтва і практычную дапамогу (семінары, кансультацыі, інкубацыйныя праграмы, працу з валанцёрамі).

**Цэнтр развіцця клубнай прасторы** падтрымлівае развіццё клубаў і гурткоў, удасканальвае тэхналогію іх запуску і развіцця.



**Служба маркетынгу** распрацоўвае і рэалізуе планы папулярызацыі адукацыйных прадуктаў у інтэрнэце, забяспечваючы іх бачнасць і прыцягненне аўдыторыі.

**Служба фандрайзінгу** выбудоўвае ўстойлівыя адносіны з донарамі і партнёрамі.

**Служба маніторынгу і ацэнкі** распрацоўвае планы ацэнкі дзейнасці арганізацыі, а таксама фарміруе бачанне яе структуры і напрамкаў стратэгічнай трансфармацыі.



**Адміністрацыйны офіс** фарміруе прафесійную каманду, распрацоўвае эфектыўныя планы мерапрыемстваў, стратэгію развіцця арганізацыі і ажыццяўляе аператыўнае кіраванне.

# Запрашаем да супрацоўніцтва!

nationofleaders.org

Фонд грамадзянскага развіцця Nation of Leaders
Вул. Каленьска 5,
04-367 Варшава, Польшча
KRS: 0000914944, REGON 389670207
NIP 1133038692
www.nationofleaders.org
contact@nationofleaders.pl